ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# МУЗЕЙ І СПАДЧЫНА




Нядаўна выйшаў з друку зборнік матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Музей і спадчына: традыцыі і інавацыі». У выданне ўвайшлі матэрыялы, агучаныя на канферэнцыі ва ўстанове “Музей «Замкавы комплекс «Мір»” у верасні 2025 года. Падзея была прымеркавана да 25-годдзя ўключэння замкавага комплексу «Мір» у Спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА.

Артыкулы, змешчаныя ў зборніку, закранаюць пытанні рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў архітэктуры, перспектывы музеефікацыі архітэктурных аб’ектаў, праблемы аднаўлення інтэр’ераў, размяшчэння ў іх музейных экспазіцый і інш.

Удзельнікамі канферэнцыі сталі не толькі беларускія навукоўцы з Мінска, Гродна, Міра, Нясвіжа, Кобрына, Ліды, але і супрацоўнікі шэрагу расійскіх музеяў. Дзякуючы даследчыкам у навуковае абарачэнне ўвайшлі матэрыялы, якія расказваюць пра першага даследчыка Мірскага замка Юзафа Ядкоўскага (Юлія Васадзэ, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей), пра стварэнне габеленаў для Мірскага замка, іх выкарыстанне ў афармленні інтэр’ераў, пра фотамайстэрню Б. Гольдзіна ў мястэчку Мір (Наталля Кавалевіч, Вольга Каласоўская, Замкавы комплекс «Мір»). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, краязнаўца Святлана Кошур (Карэлічы) аднавіла біяграфію мірскага асветніка, святара і этнографа Фелікса Сцяпуры, які паўстагоддзя аддаў служэнню царкве і людзям. Дакументы пра гісторыю роду Святаполк-Мірскіх з архіва Інстытута Гувера Стэнфардскага ўніверсітэта даследавала Вольга Навіцкая (Замкавы комплекс «Мір»).

Вельмі цікавымі з’яўляюцца матэрыялы, якія прадставіў на старонках зборніка калектыў аўтараў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (С. Віцязь, Н. Пачобут, Л. Калядзінскі, В. Кляшчонак). Вучоныя расказалі пра раскопкі на гарадзішчы Беразавец (Карэліцкі раён), вывучэнне драўлянага замка Кміты XVI – XVII стст., які з’яўляецца помнікам археалогіі, гісторыі і культуры Беларусі, і выказалі прапанову яго рэканструкцыі і ўключэння ў турыстычны маршрут у ваколіцах замкавага комплексу «Мір».

На старонках зборніка аўтары падзяліліся сваімі набыткамі і вопытам працы. Гэтыя матэрыялы могуць зацікавіць многіх аматараў гісторыі і краязнаўства. Каштоўнасць выданню надаюць шматлікія фотаздымкі і рэпрадукцыі твораў мастацтва.

**Святлана КОШУР**
**краязнаўца, член СПБ**

www.pisateli.by